Падтрымай "Вясну" на PATREON

Санітарка, былы паралімпіец, прадпрымальнік – каго і за што судзілі па дыфамацыйных артыкулах на гэтым тыдні

10.09.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, грамадства, дыфамацыя



Ілюстрацыйнае фота

Праваабарончы цэнтр "Вясна" працягвае маніторыць судовыя пасяджэнні па крымінальных справах, звязаных з нецярпімасцю беларускіх уладаў да любых формаў праяваў пратэсту. Паводле інфармацыі праваабаронцаў, самымі распаўсюджаным інструментам рэпрэсій сёння з'яўляецца крымінальны пераслед па дыфамацыйных артыкулах: за абразу прэзідэнта, прадстаўнікоў улады, суддзяў, а таксама за здзек з дзяржаўных сімвалаў (арт. 368, 369, 370, 391 КК). "Вясна" распавядае, каго і за што на гэтым тыдні асудзілі ў Беларусі па гэтых артыкулах Крымінальнага кодэкса.



Да "хатняй хіміі" і "хіміі" асудзілі шэраг грамадзянаў за абразу прэзідэнта і прадстаўнікоў улады

"Вясна" распавядае, каго і за што на мінулым тыдні асудзілі ў Беларусі па гэтых артыкулах Крымінальнага кодэкса.

Два гады "хатняй хіміі" – за фразу "яшчэ адна гніда Лукашызма"

6 верасня суд Баранавіцкага раёна і г. Баранавічы абвясціў прысуд па крымінальнай справе ў дачыненні да Дзмітрыя Бубенчыка, якога вінавацілі ў абразе міліцыянта.

Справу разглядала суддзя **Вольга Раманюк**, бок дзяржабвінавачвання падтрымліваў **Аляксандр Ярашэвіч**.

Пацярпелы міліцыянт г. Бабруйска **Андрэй Комар** у суд не з'яўвіўся праз занятасць па службе, прасіў разглядаць справу ў яго адсутнасць, а таксама заявіў пазоў на кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры 1000 рублёў.

Паводле дзяржаўнага абвінаваўцы, 8 ліпеня 2020 года Дзмітрый Бубенчык у сацыяльнай сетцы “Аднакласнікі” наўмысна пакінуў каментар пад публікацыяй Вольгі Карач з выявай супрацоўніка міліцыі – старэйшага ўчастковага інспектара Першамайскага раёна г. Бабруйска Андрэя Комара наступнага зместу: *“Яшчэ адна гніда Лукашызма”*. Гэты выраз, паводле лінгвістычнай экспертызы, з’яўляецца абразлівым, грубым, мае негатыўную ацэнку Камара, з'яўляецца ненарматыўнай формай маўленчага выказвання. Сваімі дзеяннямі Дзмітрый Бубенчык здзейсніў злачынства па арт. 369 Крымінальнага кодэкса.

Дзмітрый Бубенчык віну **прызнаў цалкам**. Патлумачыў, што ў той дзень прыйшоў з працы і прачытаў інфармацыю у “Аднакласніках пра тое, што супрацоўнік міліцыі Комар ілжэсведчыў у судах супраць людзей, а іх потым каралі суткамі. Паверыў апублікаванай інфармацыі, саму Вольгу Карач не ведае, не спраўджваў праўдзівасць інфармацыі пра міліцыянта, таму Дзмітрый напісаў такі каментар. У той момант *“на 50% усведамляў”*, што напісанае можа абразіць Комара.

Абвінавачаны не пагадзіўся з заяўленай сумай маральнай кампенсацыі, патлумачыў, што не лічыць, што моцна пакрыўдзіў міліцыянта, а таксама Бубенчык не мае матэрыяльнай магчымасці праз крэдыты і ўтрыманне сваёй сям’і.

У спрэчках бакоў пракурор прасіў суд прызнаць Дзмітрыя Бубенчыка вінаватым паводле арт. 369 Крымінальнага кодэкса, так як абвінавачаны ўсведамляў, што публічна абражае прадстаўніка ўлады і хацеў гэтага, яго віна даказаная прызнальнымі паказаннямі, пісьмовымі матэрыяламі па справе. Прызначыць пакаранне Дзмітрыю ў выглядзе абмежавання волі тэрмінам на два гады без накіравання ў папраўчую ўстановы адкрытага тыпу, мабільны тэлефон мужчыны канфіскаваць у даход дзяржавы, а таксама спагнаць з яго кампенсацыю на карысць пацярпелага, зыходзячы з прынцыпаў справядлівасці і суразмернасці.

Абвінавачаны паўтарыў, што цалкам прызнае віну, можа сплаціць 10 базавых велічынь кампенсацыі.

У выніку суд пастанавіў пакараць Дзмітрыя Бубенчыка **двума гадамі “хатняй хіміі”**.

Два гады “хатняй хіміі” санітарцы за каментар "Смерць" у “Аднакласніках”

Суд Першамайскага раёна Мінска 7 верасня разгледзеў крымінальную справу санітаркі Баранавіцкай цэнтральнай паліклінікі **Аліны Гапонік**. Яе абвінавацілі ў тым, што яна абразіла ў сацыяльных сетках прадстаўніка ўлады (арт. 369 Крымінальнага кодэкса РБ).

Справу разглядаў суддзя **Максім Трусевіч**.

Па матэрыялах абвінавачвання, у перыяд з 18 жніўня па 1 верасня Гапонік публічна абразіла прадстаўніка ўлады, прапаршчыка роты АМАП Мінгарвыканкама **Савіча** ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў. Менавіта – прадставіла яго ў прыніжаючым становішчы ў “Аднакласніках” на старонцы Пятра Зіневіча, **апублікаваўшы каментар "Смерць", які палічылі абразлівым**.

Аліна Гапонік **цалкам прызнала віну**, адмовілася ад паслуг адваката.

У яе быў праведзены ператрус, арыштаваная маёмасць (стол, ложак, тэлевізар і шафа), канфіскаваны тэлефон. У Пятра Зіневіча канфіскавалі ноўтбук.

У судзе жанчына патлумачыла, што з Пятром Зіневічам асабіста незнаёмая. Зайшла на ягоную старонку, прачытала на эмоцыях іншыя каментары пад відэа і пакінула свой. Зачыталі ранейшыя паказанні Гапонік: у іх паказана, што знаёмая асабіста з Пятром Зіневічам, у “Аднакласніках” ў сябрах, бачыць яго стужку навін. Пацярпелы Савіч даведаўся пра абразлівы каментар ад праваахоўных органаў, калі яго выклікалі з нагоды відэа і каментароў. Абвінавачаная ў зале папрасіла прабачэння.

Пацярпелы заявіў, што хоча, каб рашэнне і пакаранне было мінімальным, казаў пра тое, што *"мы займаемся дабрачыннасцю, хочам пакінуць рэквізіты Рэспубліканскага цэнтра дзіцячай анкалогіі, куды можна ахвяраваць грошы. Ну скажам, 1 000 рублёў. Я ўсе грошы ў якасці пацярпелага туды аддаю"*.

Пазоў Аліна Гапонік прызнала цалкам.

Пракурор запрасіў **абмежаванне волі на 2 гады**, матэрыяльны пазоў задаволіць, маёмасць пакінуць пад арыштам, а сімку вернуць абвінавачанай. Пацярпелы быў цалкам згодны, калі "гэта самае гуманнае рашэнне".

Пасля перапынку агучаны прысуд: **абмежаванне волі тэрмінам на два гады без накіравання ва ўстанову адкрытага тыпу. Таксама задаволены матэрыяльны пазоў у памеры 1 000 рублёў.**

Былога паралімпійца пакаралі 1,5 гадамі “хатняй хіміі” за каментар

8 верасня суд Маладзечна і Маладзечанскага раёна вынес прысуд Цімашчэню. Мужчына працуе медбратам у гарадской паліклініцы і мае інваліднасць па зроку. Ён выступаў за паралімпійскую зборную Беларусі. Яго прызналі вінаватым паводле арт.369 Крымінальнага кодэксу і асудзілі да 1,5 гадоў абмежавання волі без накіравання ў ПУАТ – “хатняй хіміі”, а таксама выплаціць на карысць пацярпелага 1000 рублёў.

Справу разгледзела суддзя **Дубовік**. Бок дзяржабвінавачання падтрымаў пракурор **Васюта**.

Да суда Цімашчэня знаходзіўся пад хатнім арыштам.

Пацярпелы – інспектар ДПС **Андрэй Баграёнак**. Пад пастом у сацсетках з ягоным фотаздымкам Цімашчэня пакінуў каментар з ненарматыўнай лексікай, якую не зачыталі ў судзе: лінгвістычная экспертыза пацвердзіла, што гэта быў зневажальны каментар. Баграёнак папрасіў маральную кампенсацыю ў тры тысячы рублёў, але на суд не з’явіўся праз занятасць на працы. Са слоў абвінавачанага вядома, што **па эпізодзе з гэтым фотаздымкам было ўжо восем крымінальных спраў**.

Ён цалкам прызнаў віну, але не пагадзіўся з сумай кампенсацыі: яна непад’ёмная для яго, улічваючы заробак у 700 рублёў.

Бок абвінавачання палічыў, што віна цалкам пацверджана і папрасіў пакараць Цімашчэню **1,5 гадамі “хатняй хіміі”**. Абаронца папрасіў знізіць суму маральнай кампенсацыі.

У выніку суддзя Дубовік вынесла такі самы прысуд і **абавязала Цімашчэню выплаціць маральную кампенсацыю ў памеры 1000 рублёў**.

Пасля закрытага суда гамельчука вывелі з памяшкання праз запасны выхад, каб ніхто не ведаў пра акалічнасці справы

Суд Чыгуначнага раёна Гомеля 9 верасня разгледзеў крымінальную справу **Аляксандра Патапенкі**. Ён абвінавачваўся ў абразе службовай асобы па артыкуле 369 Крымінальнага кодэкса. Справу разглядаў суддзя **Аляксей Хлышчанкоў**.

Ад самага пачатку судовага пасяджэння пракурор хадайнічаў, каб судовае пасяджэнне зрабілі закрытым, каб не разгалошваць звесткі, якія могуць нанесці шкоду пацярпеламу супрацоўніку міліцыі. Хаця пацярпелы ў судзе так і не з'явіўся. Не з'явіўся таксама і сведка.

Пра пацярпелага вядома, што гэта супрацоўнік міліцыі з Бабруйску.

Высветлілася толькі тое, што абвінавачваны Патапенка у сацыяльнай сетцы "Аднакласнікі" пакінуў абразлівы каментар пад фота з выявай бабруйскага міліцыянта.

Суд пастанавіў прызнаць Патапенку вінаватым і прысудзіў **два гады абмежавання волі ва ўстанове адкрытага тыпу – "хіміі"**.

Пасля прысуду Аляксандра Патапенку вывелі з памяшкання суду праз запасны выхад, каб ніхто не ведаў пра акалічнасці справы.

Год "хатняй хіміі" – за каментар «сцыкун ў пагонах»

У судзе Любанскага раёна 8 верасня паводле арт. 369 Крымінальнага кодэкса да аднаго года «хатняй хіміі» за каментар асудзілі 31-гадовага завадчаніна Эдуарда Бараздзіна. Справу разглядала суддзя Наталля Плешавеня, падтрымліваў дзяржабвінавачанне Лосік. Пад публікацыяй з рэзанансным Ганцавіцкім інцыдэнтам мінулым летам у Аднакласніках на старонцы Вольгі Карач жыхар Любані напісаў у дачыненні да супрацоўніка ДАІ Ігара Вольніча

Пацярпелым па справе выступае **Ігар Вольніч**, але па сямейных абставінах і ў сувязі з далёкасцю пражывання ён не змог з'явіцца на суд – справу разгледзелі без яго.

Паводле версіі абвінавачвання, 21 чэрвеня 2020 года ў вячэрні час, знаходзячыся па месцы свайго жыхарства ў горадзе Любань, рэалізуючы задуму на абразу прадстаўніка ўлады, інспектара ДПС АДАІ УУС Ганцавіцкага раённага выканаўчага камітэта Вольніча, які з'яўляецца прадстаўніком улады, якія знаходзяцца пад асаблівай абаронай дзяржавы, з мэтай прыніжэння гонару і годнасці, у сувязі з выкананнем ім сваіх абавязкаў па ахове грамадскага парадку і забеспячэнню грамадскай бяспекі, прафілактыцы, выяўленні і спыненні злачынстваў і адміністрацыйных правапарушэнняў, кіруючыся нізіннымі намерамі, якія выказаліся ў жаданні прадставіць пацярпелага Вольніча ва зневажальным становішчы ў вачах шырокай грамадскасці, выкарыстоўваючы ноўтбук, да фотавыявы інспектара ДПС Вольніча, які знаходзіцца ў форменным абмундзіраванні супрацоўніка органаў унутраных спраў,

апублікаванай 21.06.2020 на старонцы карыстальніка з уліковай запісам Вольга Карач сацыяльнай сеткі «Аднакласнікі», наўмысна размясціў каментар, які змяшчае ў тэксце, выказаную ў непрыстойнай форме абразу ў адрас Вольніча, негатыўна ацэньвае апошняга, і якое змяшчае ненарматыўную форму маўленчага выраза. Каментары, якія змяшчаюцца ў тэксце, зневажаюць гонар і годнасць пацярпелага Вольніча, прычыняюць яму маральныя і маральныя пакуты, падрываюць яго асабісты аўтарытэт і прафесійныя якасці, таксама аўтарытэт органаў унутраных спраў у цэлым.

Як высветлілася на працэсе, абвінавачаны пакінуў каментар у Аднакласніках пад выявай на старонцы Вольгі Карач. Малюнак, акрамя фота Вольніча, утрымліваў тэкст: *"Гэта я спрытна прыціснуў да тратуара галаву мірнага дэманстранта падчас затрымання. Ігар Вольніч. Інспектар ДПС АДАІ РУУС горада Ганцавічы"*. Пад выявай быў надпіс: *"Давайце дапаможам яму стаць знакамітым на ўсю краіну"*. Пад публікацыяй было 1788 каментароў.

Бараздзін напісаў каментар: *«Сцыкун ў пагонах»*. На судзе ён віну прызнаў.

На працэсе абвінавачаны адказаў, што гэта выйшла нечакана: *«сам ад сябе ў шоку»*. Бараздзін выказаў прабачэнні перад пацярпелым, хоць той не з'явіўся на суд. Ён распавёў, што 21 чэрвеня мінулага года ён быў на сайце "Аднакласнікі". Калі гартаў стужку, то прамільгнула фота Вольніча ў форме інспектара ДАІ, на якім ён нагой стаў на галаву іншага чалавека.

> *«Адкрыў каментары, зайшоў, і, так атрымалася, што пракаментаваў»*, – сказаў Бараздзін.

На судзе зачыталі пратакол папярэдне следства ў частцы супярэчнасцяў. Па пратаколе 16 жніўня 2021 года абвінавачаны казаў:

> *"У гэты перыяд у Беларусі праводзілася перадвыбарчая кампанія па выбарах прэзідэнта рэспублікі. Я ў ліку іншага перачытваў і ролікі, звязаныя з гэтай тэматыкай. Тады ж у стужцы навін я ўбачыў фотавыяву, на якім быў захаваны супрацоўнік міліцыі"*.

Вольніч хоць і не з'явіўся на суд, але заявіў пазоў аб маральнай кампенсацыі на суму 1500 рублёў. Абвінавачаны прызнаў пазоў.

Дзяржабвінаваўца папрасіў суд пакараць Бараздіна **"хатняй хіміяй" тэрмінам на адзін год. Менавіта такое пакаранне і прызначыў суд. Таксама суд пастанавіў спагнаць на карысць Вольніча грашовую кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры 1500 рублёў.** У Бараздзіна канфіскавалі ноўтбук як сродак здзяйснення злачынства.

У Петрыкаве мужчыну прысудзілі два гады "хатняй хіміі" за тое, што крыкнуў непрыстойнае слова на МУСаўцаў, калі яны яго збівалі

Інцыдэнт, за які асудзілі петрыкоўца, прадпрымальніка **Дзмітрыя Ляўковіча**, адбыўся ў лістападзе мінулага года, паведамляе "Палеская Вясна". Тады да ягонага брата прыйшлі з пратрусам некалькі супрацоўнікаў міліцыі. Яны шукалі нейкія бензапілы.

Брат патэлефанаваў Дзмітрыю Ляўковічуі паведаміў, што ў ягоным падворку адбываецца ператрус. Дзмітрый прыехаў і пачаў здымаць тое, што адбываецца ў прыватнай уласнасці брата, на відэакамеру.

Невядома, што такога, за што было б сорамна потым міліцыянтам, яны збіраліся рабіць на падворку Ляўковіча старэйшага, але яны ані не хацелі, каб брат абшукваемага здымаў іхнія дзеянні на відэа. У выніку адбылася штурханіна, падчас якой двое карнікаў павалілі Дзмітрыя на зямлю, закруцілі рукі, і адзін з іх пачаў з асаблівай жорсткасцю біць яго нагой у галаву, якую той спрабаваў узняць з халоднай зямлі. Таксама міліцыянты ўжылі да чалавека, які ажыццяўляў сваё права на збор і распаўсюд інфармацыі, пярцовы газ, а той, што збіваў яго, яшчэ і дастаў пісталет і пачаў пагражаць іншым сваякам. Гэта ўсё трапіла, усё ж, на відэа, якое пазней было змешчанае на YouTube-канале Ляўковіча.

Пасля такога жорсткага затрымання Дзмітрыя Ляўковіча завезлі ў лякарню са страсеннем мазгоў ды мноствам гематомаў. Пасля таго, як ён ачуняў, яго ўлады зняволілі на 15 содняў за непадпарадкаванне міліцыянтам. Увесь тэрмін зняволення ён адбыў.

Сёлета ў жніўні распачаўся суд паводле артыкула 369 Крымінальнага кодэксу. Міліцыянты, якія збілі Дзмітрыя, адчулі сябе абражанымі тым, што падчас збіцця, ён крыкнуў *«Адпусціце, п***ры!»*. Пацярпелымі аказаліся двое супрацоўнікаў міліцыі **Аскерка** і **Сярапін**. Яны звярнуліся ў суд з заявай аб абразе. Яны запатрабавалі ад яго кампенсацыю маральнай шкоды па 500 рублёў кожны. Пракурорка **Фіцнер** запатрабавала для Ляўковіча пакаранне ў выглядзе 1,5 года абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Але ў выніку яму суддзя **Федаровіч** прысудзіў **два гады абмежавання волі без накіравання ў ПУАТ**.

Два гады "хатняй хіміі" за каментар

9 верасня Фрунзенскі суд горада Мінска прызнаў 24-гадовага А. Крылова паводле арт.369 Крымінальнага кодэкса. Яму прысудзілі **два гады абмежавання волі без накіравання ў ПУАТ – "хатняй хіміі"**.

Справу разгледзеў суддзя **Андрэй Млечка**.

Згодна з абвінавачаннем, мужчына меў намер на публічную абразу прадстаўніка ўлады, у сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў. У адным з Telegram-каналаў, прызнанага экстрэмісцкім, ён размясціў каментар у дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў-міліцыянта аддзела ўнутраных спраў Бярозаўскага райвыканкама. Каментар меў абразлівы характар і змяшчаў ненарматыўную форму маўленчага выказвання.

Мабільны тэлефон канфіскаваны ў даход дзяржавы.

Таксама вядома, што Заводскі суд горада Мінска прысудзіў **Грыгарэнку тры гады абмежавання волі без накіравання ў ПУАТ – “хатняй хіміі”** – паводле арт.369 КК.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па сансетках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY